## *На паліцу краязнаўцам*

### *Анатоль Грыцкевіч. Старонкі нашай мінуўшчыны*




Доўгі час гісторыя Беларусі разглядалася скрозь прызму гісторыі Расіі. І так было не толькі ў школьных класах, але і ў студэнцкіх аўдыторыях ды ў навуковых кабінетах. Вядомы беларускі гісторык, прафесар, грамадскі дзеяч Анатоль Грыцкевіч адраджае праўдзівую айчынную гісторыю, якая разам з беларускай мовай складае аснову нацыянальнай дзяржаўнасці беларусаў. Кніга «Старонкі нашай мінуўшчыны» – зборнік унікальных артыкулаў пра знакавыя асобы і аб падзеях гісторыі, пачынаючы ад Беларуска-Літоўскай дзяржавы (XIV ст.) да сённяшніх дзён.

Артыкулы напісаныя грунтоўна і займальна, таму будуць цікавыя шырокаму колу чытачоў – ад аматараў гісторыі да навукоўцаў.

Выпусціла кнігу выдавецтва «Кнігазбор» дзякуючы МГА «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"» і кіраўніку Дабрачыннага фонду «Этнічны голас Амерыкі» (ЗША) Ірэне Калядзе-Смірновай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ